ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 119 (501) Субота, 22 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тел. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

10 РЫХТУЕМ КАСТРЫЧНІКАЎСКІ ПАДАРУНАК !

СЁНЬНЯ — СЕМНАЦЦАТЫ ДЗЕНЬ УСЕБЕЛАРУСКАГА МІТЫНГУ ЧЫТАЧОЎ ГАЗЭТЫ

Падлічвайце дасягненьні.

Прамова прадстаўніка газэры „Чырвоная Зьмена“.

Мы суботнік праводзім для таго каб у дзень 10-годзьдзя паднесьці вялізарны падарунак—дапамогу бяспрытульным, а таксама шэраг грамадзка-карысных работ у вёсцы.

У значнай частцы, асабліва ў гарадох, суботніцкая работа аплачваецца, але ў вёсцы і на некаторых прадпрыемствах, работа праводзіцца дармова.

Але і тое і другое—і аплачваемую і дармовую работу—трэба дакладна падлічыць. Аб сумах грошай якія атрыманы за працу альбо грашовую ацэнку дармовай працы,—трэба тэрмінова паведамляць у раённыя камітэты комсамолу, райкомы ў сваю чаргу перасылаюць у акругком агульна-раённую сводку.

Вучот у гэтай справе мае практычнае значэньне. Вучот дасьць магчымасьць падлічыць у грошах колькасьць і якасьць выкананай рбботы.

Вучот суботніку—ня вузка канцэлярская справа, яго прарабіць гэтак старанна, як старанна рыхтаваліся да суботніка. Побач з лічбавым вучотам вельмі неабходна ўзмацніць на старонках як «Чырвонай Зьмены», гэтак і акруговых газэт асьвятленьне саміх суботнікаў.

У аднэй з папярэдніх прамоў прыводзіўся сьпіс буйных прадпрыемстваў, якія ня выказаліся на мітынгу.

Толькі некаторыя з іх выказаліся, а астатнія — маўчаць («Дзьвіна», «Высачаны», гомельскія прадпрыемствы, завод «Барань» і г. д.).

Чарговая нядзеля зьявіцца галоўным, найбольш моцным момантам праходзячай зараз паласы суботнікаў.

Праводзячы з працоўным уздымам суботнікі палепшым іх высьвятленьне ў друку і з няменшай уважлівасьцю, старанна падлічым дасягненьні.

Таксама ... „суботнік“.

Джойнсон Хікс спрабуе сарваць паездку дэлегацы ангельскіх рабочых на Кастрычнікаўскія сьвяты.



Далей свайго носу ня бачым.

Прамова Міколы Глуха.

(Барысаў сель-гасп. тэхнікум, ячэйка ЛКСМБ).

Тэхнікум надумаўся паставіць рады к гадавіне Кастрычніка. Для гэтага прaeвялі 4 «нядзельнікі». Гэта добра. Але мы **перасталі бачыць далей свайго носу** і забылі аб суботніку на карысьць бяспрытульных.

Бюро сумесна з актывам ухваляе: «адпрацаваць **паўдня** на карысьць бяспрытульных, зрабіць гэта ў будні дзень».

— «У будні дзень» —гэта значыць што пасьля паўдня сарваць школьныя заняткі. У нядзелю—шкада, бо нядзеля дзень адпачынку, не для бяспрытульных-жа яго аддаваць.

Акрамя гэтага паўстала яшчэ адно пытаньне як-жа лепей уцягнуць дарослых рабочых у суботнік? **Зусім нечакана** актыў ухваляе: «агітацыі за суботнік сярод дарослых рабочых **ня весьці**; абыйсьці іх з падпісным лістом».

Абыйсьці з падпісным лістом—справа лёгкая; і дадуць ці не дадуць—не вялікі клопат.

Унесьлі прапанову: закупіць для распаўсюджваньня аднадзенную газэту «Наш падарок Октябрю» (выданьня «Комсом. Правды»).

Актыў ухваляе: «**ня трэба**, хто захоча, пойдзе на пошту і купіць» (жывем ад гораду **ў 4-х вярстох**). Яшчэ на сьмех паднялі гэту прапанову.

Ганьба!

Наша баявая зводка

Старшыня мітынгу: Лік прамоўцаў з кожным днём усё павялічваецца. Каб даць магчымасьць усім гэтым таварышам выказаць свае думкі, мы ніжэй зьмяшчаем кароценькія фактычныя вытрымкі з іх прамоў.

— **Вучні Круглянскай сямігодкі** адрамантавалі папсаваную дарогу *У. Ганкевіч.*

— **У гор. Мсьціслаўлі** ў суботніку працавала 300 чалавек. Капалася бульба і рэзаліся дровы. *А. Янчэнка.*

— **Талочынскі раён** Нова-Сельская ячэйка зрабіла мост. Дзьве Азярыцкія ячэйкі (адна вытворчая, другая вясковая) направілі забалочаную дарогу. Скрынская ячэйка зарабіла 50 рублёў. Працавалі ў саўхозе. Удзельнічала таксама 35 беспартыйных. *Віцька.*

— **Мозыр.** Фабрыка «Чырвоны Кастрычнік».—23-га кастрычніка фабрыка будзе цалкам пушчана. Маркуецца зарабіць каля 500 рублёў. *М. Нодэльман.*

— Комсамольцы, якія працуюць у ЦВК, зарабілі 15 рублёў. *Сыс.*

У Лепелі на суботніку, акрамя комсамольцаў, працавала 12 бяспрытульных. Усяго зароблена 70 руб. *С. Рудчанка.*

Броварка запрацуе поўнасьцю.

Прамова тав. Плаўніка.

Рабочы броварнага заводу імя Леніна.

У гэты дзень, як і заўсёды, завод быў поўны лязгу і гоману, грукату і шыпеньня. Несьліся пыльныя ад мукі ваганеткі, скрыпелі ламавікі падвозячы збожжа да вагонаў.,.

У гэты дзень на звычайнай дошцы ааяў, вісела малеькая паперка:

Жадаючыя працаваць запрашаюцца да вагонаў на пагрузку.

Гэта быў першы агітацыйны суботнік, мэта якога была «раскачаць» масу, да вялікага заводзкага суботніка.

І прышоўшыя шэсьць чалавек зрабілі гэта. Мы пагрузілі два вагоны збожжа, мы атрымалі—**12** р.

Справа была зроблена.

Завод загаварыў аб суботніку, ля варштатаў, кранаў, толькі і чутна было:

— Як пусьціць завод!

— Ці прыдуць усе працаваць...

— Што зрабіць са зьменамі!

Пытаньні суботніка абгаварыліся горача. Завод працуе трохзьменна. Суботнік правесьці вельмі цяжка.

І парашыў завод, у словах рабоых, заявіўшых а згодзе працаваць, парашыла адміністрацыя і ячэйкі.

А апрача ўсяго ячэйка комсамолу як галоўная віноўніца гэтага, рашыла сваімі сіламі пусьціць млын.

8 чалавек будуць працаваць у ім,.

Дуброўна дасьць 5000 рублёў.

Фабрыка пускаецца поўным ходам.

Прамова рабочага фабрыкі тав. С. Галавічара.

Прачытаў я ў «Чырвонай Зьмене», што да гэтага часу ва Ўсебеларускім мітынгу чытачоў, наш колектыў яшчэ ня выказаўся. А мы-ж рыхтуемся, працуем і ад другіх не адстаем у правядзеньні комсамольскага суботніка.

Цяжкасьцяў пры правядзеньні суботніка ў нас хоць адбаўляй (зьменная работа, меткі, мала падмайстраў і запраўшчыкаў з асяродку самой моладзі). Суботнік сустрэў жывы водгук сярод дарослых рабочых. На агульным сходзе рабочых дарослыя рабочыя віталі пачын комсамолу.

Будуць працаваць прыблізна 400 чалавек, што дасьць 500-600 руб.

Зарабілі 250 рублёў.

Прамова тав. Эмэлова.

(Магілеў).

У суботу, у вечары каля будынку акругкому партыі хутка зьбіралася грамада комсамольцаў і рабочай моладзі.

Трэба ехаць у Шклов для правядзеньня комсамольскага суботніка.

З вясёлымі, бадзёрымі песьнямі ішлі [illegible] станцыі.

Ня доўга прышлося чакаць «экспрэса»—таварнага цягніка з вялікім составам [illegible]гонаў.

* * *

Назаўтра з 7-ай гадзіны раньня—за работу.

Самая суровая дысцыпліна (на сьняданьне—10 хвілін).

25 чалавек застаецца ў Шклове для пачынкі шляху, а 240—пасоўваюцца далей, на станцыю Копысь.

Працавалі да 4-ай гадзіны, нагружаючы вагоны пяском. Ня гледзячы на цяжкасьць працы, ня было сярод комсамольцаў стомленасьці, ня было суму.

Хлопцы працавалі з запалам.

Нагрузілі два составы цягнікоў у 68 вагонаў.

Лепей усіх працавалі партшкольцы, крыху горш—профшкола мэталістаў.

Але нарэшце—і суровыя чыгуначныя майстры пахвалілі комсамольскую работу.

Усяго зарабілі 250 рублёў.

* * *

У Магілеў, назад, ехалі ў адчыненых «салён-вагонах», на пляцформах...

Але вясёлы настрой ня зьнікаў!..

М. Л.

Правялі 2 суботнікі.

(Прамова тав. Дрэйзіна).

Ячэйка Хлебапрадукту правяла 2 суботнікі на карысьць бяспрытульных.

У першым суботніку ўдзельнічалі ўсе супрацоўнікі ахопленых ячэйкай установ; зарабілі 134 руб. 67 кап.

Другі суботнік быў праведзены ў самым Хлебапрадукце. Зьявілася 80 проц. усіх супрацоўнікоў. Ячэйка падрыхтавала да суботніка належныя лёзунгі.

На гэты раз мы зарабілі 42 руб. 82 кап.

Суботнік Унівэрмагу.

Прамова ўдзельніка тав. Ігнацьева.

Ячэйка комсамолу МЦРК правяла сход служачых Унівэрсальнага магазыну № 21.

Вось вынікі сходу.

25 чалавек беспартыйных служачых у дзень адпачынку сераду—зьявіліся ў поўным складзе на работу.

«Хворых» ці „спазьніўшыхся“ ня было.

Заробак за дзень раўняецца—**100** руб.

Беспартыйных удзельнічала больш, чым комсамольцаў.

Прамова Язэпа Саладкова.

(Лупалаўскі раён).

Пры разглядзе пытаньня аб суботніку бюро райкамолу, выходзячы з мясцовых умоў кожнай ячэйкі дало паказаньне па



ячэйках, дзе правесьці суботнік, што канкрэтна зрабіць і г. д.

У ячэйках **Грэбенева** і **Вэйна** удзельнічала з двух ячэек комсамольцаў — 28 чалавек, беспартыйных—35 чал.

Дружна працавалі, падганяючы адзін другога цэлы дзень

Выкапана 1500 пудоў буракоў, з іх 200 пудоў ачышчана. Выкапана з зямлі на 1 арш. глыбіні 15 саж. вадаправодных чыгунных труб (астача ад старога броварнага заводу), вывезена на агарод 15 парных вазоў гною—375 пудоў. Прывезена ў канюшню 35 вазоў зямлі на адлегласьці 150 саж. (гэта прывожу з ведамственнай кнігі саўхозу).

За гэтую работу саўхоз заплаціў 42 р. 30 кап.

Пад грукат каменьняў

Прамова тав. Самцова

Сакратар чыгун. ячэйкі ст. Барысаў

У 8 гадзін на рэйках нас ужо чакала 20 таварных вагонаў.

20 вагонаў стаялі пустымі на запасных шляхох.

Ячэйка ў ліку 35 ч. і 7 беспартыйных рабочых зьявілася на суботнік, да гэтых 20 чакаючых вагонаў.

Было зусім яшчэ рана. Ля запасных шляхоў цягнуліся акрыны. На панадворкі выходзілі людзі, зьдзіўлена пагдядаючы, на нязвычайных рабочых, прышоўшых працаваць з песьнямі і сьцягамі.

Дуў моцны вецер, ён далёка разносіў песьні, скупыя і простыя словы прамоўцаў, гаварыўшых з трыбун—вагонаў...

Работа пачалася па сыгнале.

Вялізарнейшыя глыбы каменьняў, загрукацелі па вагонах. Такое кананады, такога грокату ніхто з нас ня чуў.

Прышоўшыя працаваць разам з намі піонэры стараліся свой вагон нагрузіць чым хутчэй. Яны ўтраіх, ці чатырох цягалі вялікія каменьні.

Работа так захапіла нас, што 20 вагонаў каменьня, якія грузяцца цэлы дзень такой-жа колькасьцю рабочых, мы пагрузілі за некалькі гадзін.

Калі кончылася работа, зноў строем, з песьнямі і сьцягамі мы пайшлі назад.

На пэроне вакзалу, нас сустракалі рабочыя з оркэстрам музыкі. Тут-жа на рыштаваньнях пабудовы пачаўся мітынг.

Усяго зарабілі 60 рублёў.

Яны чакаюць дапамогі.



Піянэрскі ўзнос.

Слова т. Мельцэра.

(Адрад банкаўскіх установ).

У нядзелю па менскіх вуліцах рассыпаўся наш атрад...

Хто куды!

Некаторыя беглі па цэнтральных вуліцах, а некаторыя звеньнямі ішлі на рабочыя акраіны.

А 12 гадзіне ў клюбе нікога ўжо ня было... З лістоўкамі „пазыкі індустрыялізацыі“ разышоўся атрад.

І калі вы сустракалі радасных хлапцоў з пачкамі ў руках, дык ведайце гэта былі піонэры нашага атраду.

Увечары лістовак ужо ня было...

Наш удзел у суботніку быў добры.

Піонэры даказалі, што яны могуць быць добрымі памоцнікамі комсамолу.

За распаўсюджваньне атрад атрымаў з галоўнай касы ашчаднасьці 7 рублёў.

„Пасьпяшыш—людзей насьмяшыш“.

(Па поваду допісу тав. Анішчука, аб працколект. друкароў).

Мы мелі ўдзел у суботніку сто пропантаў комсамольцаў і 25 беспартыйных рабочых.

Што-ж тычыцца комсамольцаў, якія не зьявіліся на суботнік, дык два з іх прыналежаць да ячэйкі першай друкарні. Аб іх паведамлена ў бюро ячэйкі. Адзін быў у водпуску, два другіх будуць працаваць з другой ячэйкай.


Некаторы дэфіцыт дало лінавальнае аддзяленьне. Там працавалі ўсе некваліфікаваныя рабочыя. Дэфіцыт вызначыўся ў 4 р. 70 к., а не ў 25 рублёў, як паказаў Анішчук. Астатнія аддзяленьні працавалі інтэнсыўна і далі прыбытак.

У агульным суботнік страты ня даў.

Подпісы прадстаўнікоў фабкому, ячэйкі КП(б)Б і ячэйкі ЛКСМБ.







СЁНЬНЯ МЫ ДРУКУЕМ МАТАР'ЯЛЫ АБ ПЫТАНЬНЯХ БЫТУ

Хваробных зьявішчаў—шмат. „Курыца ня птушка, баба не чалавек“.—Ці трэба клапаціцца аб сям'і?—Заднія думкі некаторых комсамольцаў.

ЯЧЭЙКА НЯ ЦІКАВІЦЦА БЫТАМ МОЛАДЗІ.—ЯЧЭЙКА НЯ ВЕДАЕ, ШТО РОБЯЦЬ КОМСАМОЛЬЦЫ ЗА ВАРОТАМІ ФАБРЫКІ.—АДЧУВАЕЦЦА ЎПЛЫЎ ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ.

Трэба палажыць канец нядбайнасьці ячэйкі ў гэтых адносінах.

Ячэйка—сама па сабе, а быт моладзі—сам па сабе.

У часе прагляданьня пратаколаў бюро і сходаў ячэйкі, мне прышлося азнаёміцца з тымі неэтычнымі ўчынкамі, якія наглядаліся і наглядаюцца за комсамольцамі.

З індывідуальных справаздач відаць, што некаторыя комсамольцы дрэнна вядуць сябе дома, нерацыянальна скарыстоўваюць свой заробак, наведваюць рэлігійныя шлюбы і г. д.

Якія-ж меры супроць гэтага прымала ячэйка?

— Трэба адзначыць, што далей індывідуальных справаздач і «прымяненьня мераў саюзнага ўзысканьня»—справа не крануласся.

Вакол усіх гэтых учынкаў не стваралася грамадзкая думка на фабрыцы. Акрамя пастаноўкі агульнага дакладу аб комсамольскай этыцы, на сходзе ячэйкі ніякой растлумачальнай работы больш не праведзена.

Гэтым і тлумачыцца такое зьявішча, калі з дзесятку дзяўчат, працуючых на фабрыцы, комсамолкамі зьяўляюцца толькі 4.

Гледзячы на бясчыннае павядзеньне быўшага комсамольца ячэйкі т. Гарэліка, беспартыйная дзяўчына заявіла: «адно толькі гэта стрымлівае мяне ад уступленьня ў комсамол»

Праўда. Гарэліка з комсамолу выключылі, але выключылі так, што аб гэтым рабочыя ня ведалі.

У агульным трэба сказаць, што пытаньням быту моладзі комсамольская ячэйка абутковай фабрыкі ўдзяляла зусім мала ўвагі. **М. З.**

Ганебнае зьявішча.

Есьць у нацяжным аддзяленьні варштат ручное зьбіўкі. Ля варштату працуюць і некаторыя комсамольцы, як **Шыфрын, Карпель** і інш.

— Няма тут нічога дзіўнага,—скажа чытач.

— Пачакайце тады, даражэнькі таварыш. Прайдзецеся каля гэтага варштату. Вы прайшліся? Ну, што ў вас такая кіслая фізіономія стала?

— Вы думаеце, што да гэтага можна аднесьціся роўнадушна? Ну, і варштат! Я там чуў усе тыя словы, якімі багата нецэнзурная чалавечая мова. Мяне абзывалі і «фонэ» (мужык) і рознымі пахабнымі словамі.

А комсамольцы!.. Яны хоць-бы слова супроць гэтага сказалі. Яны і самі «крыюць», на чым сьвет...

Рабочыя ўсяго аддзяленьня, адарваўшыся ад работы, раскрылі раты і ўважліва прыслухоўваліся да «концэрту».

І гэткія «концэрты» ля варштату зьбіўкі бываюць амаль штодзенна. Акрамя ўсіх тых слоў, ад якіх вушы вянуць, «концэрты» некаторым чынам адбіваюцца і на вытворчасьці працы.

Гэтаму трэба пакласьці канец. **Газ.**

Вучань, запамятай.

20-га кастрычніка на пасяджэньні фабкому разглядаліся матар'ялы нарады майстраў і вучняў па пытаньні аб вучнёўстве.

Фабком ухваліў:

Усе пастановы памянёнай нарады зацьвердзіць з наступнымі зьменамі:

— Пытаньне аб тав. Юдэлевіч лічыць скончаным, паколькі яна перайшла на работу на брусовачнай машыне і гэтым задаволена.

— Даручыць т. Шчалкаліну дамовіцца з дырэктарам фабрыкі аб прымацаваньні т. Зальцман да рабочых, якія строчаць саюзкі і аблажэньне.

— Даручыць т. Шчалкаліну да наступнага пасяджэньня фабкому дамовіцца з саюзам адносна т. Санчука.

— У просьбе т. Сагаловіча, якая зводзіцца да таго, каб усе работы дазволілі яму выконваць на ранейшым стале,—адмовіць, паколькі гэта будзе выклікаць розныя непаразуменьні паміж навучаючымі яго рабочымі.

Комсамолец, сям'я і палавое пытаньне.

Яны дапамагаюць бацьком.

Большасьць комсамольцаў нашай фабрыкі, якія жывуць у сям'і, аддаюць увесь свой заробак бацьком, за што апошнія іх і кормяць і адзяюць.

Як прыклад, у гэтых адносінах, можна прывесьці таварышоў: Кантара, Герайціса, Зальцман, Каца С. і Сагаловіча Ківу.

Бацькі іх кажуць: „Вот добра выхоўваць нашых дзяцей, што лепш ня трэба“.

Бацькі клапоцяцца аб дзецях-комсамольцах.

Аб адносінах бацькоў да сваіх дзяцей-комсамольцаў можна судзіць па наступным:

— Калі матка С. Каца аднойчы купіла была вінаграду, то малодшым дзецям нічога не дала, а захавала для яго.

Яна, таксама, даволі часта прыходзіць у ячэйку з запытаньнямі: што рабіць з вучобай яе сына, ці мае ён права хадзіць на рэлігійныя шлюбы і г. д.

У часе выхаду комсамольскай організацыі ў лягеры, клапатлівая матка пастаралася яго лепш адзець, „каб не прастудзіўся.

— Быў выпадак, калі Кантар З. захварэў і яго бацька—беспартыйны рабочы прыходзіў у ячэйку плаціць за свайго сына сяброўскія ўзносы.

Далей ісьці няма куды.

Есьць у нас і адваротнае, лепшым прадстаўніком чаго можа быць т. Ф.

— Ён гады два зусім ня жыў у сваіх бацькоў і даў ім за гэты час толькі дзьве шуркі дроў.

А дома—бацька, які ходзіць жабраваць, матка і дзьве малодшыя сястры.

І гэта ў той час, калі Ф. зарабляе ў месяц 70—75 рублёў!

Нявольна паўстае пытаньне: — Дзе-ж ён дзявае свае грошы?

Адказваем: Прагульваў, бо гуляў наш „паважаны“ таварыш Ф. па цэлых начах, покуль „нагуляў“ алімэнты, за што нядаўна судзіўся.

Думае толькі аб сабе.

Не далёка адстаў ад т. Ф. і т. Ліўшыц, які зараз займаецца на другім курсе школы павышанага тыпу.

Хлапец—індывідуаліст. Свае асабовыя інтарэсы ён ставіць вышэй грамадзкіх. Калі, да прыкладу сказаць, організоўваецца якаянебудзь дэмонстрацыя і яму трэба мыць палы, дык ніколі ня пойдзе на дэмонстрацыю. На бюро ячэйкі колькі ні вызывай, ніколі ня зьявіцца.

Затое любіць Ліўшыц бегаць за „юбкамі“. Доўгі час гуляў ён з аднэй дзяўчынай, абяцаў жаніцца, але цяпер кінуў, надаела і ходзіць да другой.

Што далей будзе з ім,—сказаць цяжка.

Погляд хлапцоў на дзяўчыну.

Глядзяць хлапцы на дзяўчыну, як на дзяўчыну, „бабу“, з якой можна толькі пагуляць, і ня толькі там сабе пагуляць, а і скарыстаць. Як-жа інакш?—адказваюць яны на ваша запытаньне.

Калі-ж вы пачнеце з тым ці іншым хлапцом (але такіх хлопцаў, падкрэсьліваем—



Тав. Кантар.

адзінкі) гутарыць аб палавым жыцьці «па душам“, дык ён вам скажа вось якую сваю агульную думку па гэтым пытаньні:

— Я—не манах. Жаніцца—яшчэ малады, а алімэнтаў плаціць не хачу. Выхад з гэтага толькі адзін—дзяржаве трэба адчыніць публічныя дамы. І калі гэта будзе зроблена, тады і хвароб ніякіх ня будзе, бо дахтары павінны будуць глядзець за імі (жанчынамі публічных дамоў).

Вось да чаго даходзяць у сваіх разважаньнях асобныя хлапцы! **Ікс і Ігрэк.**

Бацька аб сыне.

— Мой сын—комсамолец, зарабляе ў месяц 32 рублі. Увесь заробак, акрамя аднаго рубля, аддае ў сям'ю.

Увечары дома ня бывае—ходзіць у вячэрнюю школу павышанага тыпу. Дзе ён яшчэ бывае, ня ведаю. П'яным дамоў ня прыходзіць.

Дапамагаць матцы, колькі яна ні просіць яго, ня хоча.

Дрэнна хлапец адносіцца да сваіх малодшых братоў і сясьцёр—на ўсе іх запытаньні, альбо **зусім не адказвае**, альбо калі і адкажа, то не па-людзку.

З газэт чытае ён «Рабочий» і «Чырвоную Зьмену». **Рабочы Герайціс.**

Аб сабе скажу наступнае:

Увесь заробак — 27 рублёў аддаю бацьком. Раней хацела пашыць сабе паліто, на што 3 месяцы зьбірала грошы, але калі дома стварыўся грашовы крызіс —аддала іх у сям'ю.

Рабіць дома няма чаго. Пасьля фабрыкі штодня чытаю бэлетрыстыку, у тым ліку крыху і рэволюцыйную. 6-7 гадзін у тыдзень займаюся ў хоры музтэхнікуму і 4 гадзіны ў спортгуртку клюбу гарбароў.

Для сябе выпісваю «Комсомольскую Правду», «Голос Кожевника» і для маткі —часопісь «Работніца і Сялянка».

Раней з маткай жыла дрэнна, часта сварылася, а цяпер адносіны паміж намі крыху палепшыліся.

Гуляю многа, дамоў прыхожу часам і надта позна, што я і сама лічу дрэнным. **Юдэлевіч.**

На кватэры комсамольца.

З жыльлём зусім дрэнна.

Я—на Гандлёвай, у кватэры комсамольца **Крэмера**.

Кватэра—камгасаўская. Цёмна. Ледзь узабраўшыся на 3-ці паверх, у калідоры я наткнуўся на штосьці цьвёрдае. Дровы—аказваецца.

«Удобствы» жыльля такія вялікія, што другога месца для іх нідзе няма. Выпадкова зайшоўшаму сюды пагражае нячаканы «сюрпрыз»—«драўляны патоп».

Камгас аб гэтым ведае. І ня толькі аб гэтым. Ён таксама ведае, што ў **гэтай маленькай кватэрцы скучаны 3 сям'і рабочых,** што ў кватэры **вялікая сырасьць,** а маючаяся адна толькі маленькая **печка—уся паломана.** А калі жыльцам патрабуецца вада, дык яе так лёгка ня знойдзеш, прыходзіцца хадзіць за ёю «за трыдзевяць зямель», бо **ў кватэры няма вадаправоду.**

Камгас даўно ўжо абяцаў зрабіць «усё патрэбнае», але покуль-што яго **прадстаўнікі яшчэ ні разу не наведвалі гэтага забытага кутка.**

— **Можа газэта дапаможа?**—пытаюцца рабочыя—жыльцы кватэры № 4, па Гандлёвай, 23.

Перад судом „сямейнага савету“.

Малады Крэмер толькі што прышоў з фабрыкі. Убачыўшы мяне, ён быў надта **зьдзіўлены**. І было чаму—за ўвесь час свайго прабываньня ў комсамоле, **Крэмер яшчэ ніколі ня бачыў у сябе дома вока ячэйкі**, ён нават і ня марыў аб гэтым.

Хутка вакол вялікага стала ў сярэдзіне пакою сабралася ўся сям'я. Гэта быў сапраўдны суд, **пашыраны „пленум сямейнага савету“.**

Маці Крэмера з ахвотай расказвае аб усім: аб кепскіх умовах кватэрнага жыцьця і г. д.

12-гадовы брат Крэмера **Эля расьце буянам, гультаём. Маці проста плача ад яго. Пры злосьці Эля можа накінуцца на каго-небудзь і з сякерай.** Эля быў піонэрам, але зараз чамусьці атрад пакінуў.

Брат **комсамолец такімі „дробязямі“ зусім ня цікавіцца** ў той час, як маці цішком хварэе за тое, каб сын быў піонэрам, каб ён вучыўся чаму-небудзь карысламу.

Нават белагаловы «карапуз» Зіначка, якая ходзіць у дзіцячы сад, таксама **выказвае ў гэтым сваю згоду з маткай.**

Пастукваючы вілкай па стале, яна прыпявае: **піонэрчыкі, „чырвоныя зорачкі“.**

Маці Крэмера працуе на табачнай фабрыцы Менсельпрому. У яўрэйскі «судны дзень» **яна разам з другімі рабочымі фабрыкі працавала на карысьць комсамольскага суботніка,** свой дзённы заробак поўнасьцю аддала на дапамогу бяспрытульным.

У гэтым годзе **яе абралі делегаткай.** Зараз пачала вучыцца, бо яна граматная. А сын—комсамолец, вядома, такімі пытаньнямі зусім ня цікавіцца і выйсьці сваёй матцы з цемнаты зусім не дапамагае.

„Дапамога“ Крэмера сваёй матцы

Прыходзячы з фабрыкі,—расказвае Крэмер,—я крыху адпачываю і «шамаю». Кніжак ня чытаю, а з газэт—праглядваю «Юнгэр Арбэйтэр». У сярэднім бываю дома 3-4 гадзіны ў дзень, а астатні час—**гуляю.**

Матэрыяльнае становішча сям'і Крэмера досыць цяжкое. Бацькі няма, маці ў месяц зарабляе ўсяго толькі 44 рублі. Комсамолец-жа Крэмер, які жыве і «шамае» у сваёй мацеры, **дае ёй за гэта з 50-цірублёвага месячнага заробку ўсяго 20 рублёў.**

— Астатнія грошы,—кажа Крэмер, —мне патрэбны на вопратку.

— **Нічога з ім не паробіш**—адказвае маці. Пры жаданьні, ён бы мог мне і больш дапамагчы, **але ня хоча.**

Чаму-ж не дапамагчы?—пытаемся мы.

Міх. Зак.

Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Буйная забастоўка нямецкіх вуглякопаў.—Яны дамагаюцца памяншэньня рабочага дню і павялічэньня заробку.—Перамога комуністых на выбарах у Чэха-Славакіі.

Забастоўка нямецкіх вуглякопаў.

У сярэдня-нямецкім вугальным раёне 17 кастрычніка выбухнула забастоўка.

Агульны лік рабочых на прадпрыемствах, дзе здабываецца буры вугаль, дасягае 80 тысяч чал.

У першы дзень забастоўкі ня вышла на працу 90 проц. усіх рабочых.

А зараз у шмат якіх акругах бастуюць усе вуглякопы.

Адміністрацыя некаторых буйных раёнаў зьвярнулася да цэнтральнага забастовачнага камітэту з прапановаю ліквідаваць забастоўку.

Забастовачны камітэт заявіў, што ў выпадку, калі «тэхнічная дапамога» (буржуазная штрэйкбрэхерская організацыя) ня будзе зьнята, дык камітэт паставіць пытаньне аб спыненьні ўсіх работ па забесьпячэньні безапаснасьці капальняў.

Організацыя прадпрыемцаў і рэформіцкія правадыры імкнуцца да спыненьня забастоўкі.

З гэтаю мэтаю прадпрыемцы, шляхам згоды з мясцовымі забастовачнымі камітэтамі, спрабуюць распачаць працу на пасобных прадпрыемствах.

Соцыял-дэмократы і профсаюзныя «правадыры» імкнуцца сарваць забастоўку. Комуністычная партыя працягвае кампанію за забастоўку і ў іншых галінах прамысловасьці.

Рэволюцыйныя організацыі заклікаюць усіх працоўных актыўна праявіць сваю салідарнасьць з бастуючымі.

Ужо зараз спынена дастаўка вугалю ў буйнейшыя цэнтры Нямеччыны.

За што змагаюцца вуглякопы?

У канцы 1924 г., пасьля таго, як нямецкія рабочыя былі разьбіты, у Сярэдняй Нямеччыне была ўтворана «згода» з рабочымі капальняў.

Формальна быў устаноўлены 9-10-цігадзінны дзень, які фактычна працягваўся да 12 гадзін.

Гэта «часовая» згода цягнецца ўжо 3-ці год.

І цяпер яшчэ, ня гледзячы на вялізарныя прыбыткі, якія заграбаюць уласьнікі капальняў, вуглякопы працуюць па 9 з паловай гадзін у дзень.

Прычым заробак вуглякопаў надзвычайна малы.

Усё гэта разам і прымусіла вуглякопаў выступіць на вуліцу з сваімі патрабаваньнямі.

І ня гледзячы на тое, што профсаюзныя вярхі і соцыял-дэмократы ўвесь час імкнуліся не дапусьціць забастоўкі, яна ўсё-ж такі выбухнула.

Чым скончыцца забастоўка, яшчэ не вядома.

Але яна досыць яскрава сьведчыць аб палявеньні рабочых Нямеччыны. Аб пашырэньні ў іх клясавае самасьвядомасьці.

Посьпехі чэха-славацкай компартыі

Мы ўжо пісалі аб буйнай перамозе, на выбарах у гарадзкія думы, нямецкай і польскай комуністычнай партыі.

Але ня меншую перамогу мае і компартыя Чэха-Славакіі.

Вынікі выбараў у гарадзкія і вясковыя кіраўніцтвы паказваюць на посьпехі комуністых.

У шэрагу мясцовасьцяў, комуністыя павялічылі лічбу галасоў на 13 процантаў, у параўнаньні з мінулымі выбарамі.

Цікава і тое, што ў Празе (сталіца Чэха-Славакіі) комуністыя атрымалі 17 мандатаў, а соцыял-дэмократы—12.

Іншымі словамі, комуністыя маюць большы ўплыў на масы, чым соцыялістыгоднікі.

Комуністыя набылі зараз на 4 тысячы галасоў больш, чым на парляманцкіх выбарах.

Найбольшую лічбу страцілі нацыянал-соцыялістыя.

Палявеньне, рэволюцыянізаваньне рабочых мас ідзе шпаркім крокам.

Гэта пацьвярджаецца штодзённымі фактамі. **Алёнін.**

Сёньня першыя зборы політшкол.

Ячэйкі! Старанна праверце падрыхтаванасьць да вучобы!

Забясьпечце нормальныя занятні, іх ідэйную якасьць, жвавасьць і прывабнасьць для моладзі!

За вучобу!

Першыя заняткі політшкол будуць прысьвечаны пытаньням, зьвязаным з надыходзячым партыйным зьездам. Абавязак кожнага комсамольца са ўсёй сумленнасьцю аднесьціся да глыбокага вывучэньня гэтых пытаньняў, да вывучэньня ленінскай тэорыі. Чым больш узброены комсамольцы ведамі ленінізму, тым ідэйней і цьвярдзей організацыя, тым яна больш падрыхтавана даць адпор антыленінскім ухілам. З гэтай прычыны вучобу ва ўсёй нашай рабоце мы высоўваем на першы плян.

Сёньня ў політшколах будуць праводзіцца першыя папярэднія гутаркі, прысьвечаныя пытаньням організацыі работы, азнаямленьню з плянамі і г. л. Гэтыя гутаркі зьявяцца праверкай падрыхтаванасьці нашых ячэек к таму, каб праз тыдзень па ўсёй організацыі вялізарную і складаную машыну вучобы пусьціць поўным ходам.

Першыя зборы політшкол дадуць магчымасьць падлічыць памылкі і промахі, допушчаныя ў падрыхтоўчай рабоце. Гэтыя промахі павінны быць уважліва ўлічаны і выпраўлены з першых-жа дзён. Былі факты недапусьцімай нядбайнасьці шэрагу ячэек да падрыхтоўкі к зімовай вучобе. Гэта не павінна быць. Абставіны патрабуюць ад нас максымуму організаванасьці і згуртаванасьці.

Хай кожная ячэйка яшчэ і яшчэ раз са ўсёй уважлівасьцю праверыць падрыхтаванасьць да вучобы і прыкладзе ўсе патугі да таго, каб забясьпечыць нармальны ход вучобы, яе ідэйную якасьць, жвавасьць і прывабнасьць для мас моладзі.

Як палепшыць якасьць вучобы.

Нізкая якасьць нашых кіраўнікоў адна з асноўных прычын дрэннага зьместу вучобы. Аб гэтым гаворыць вопыт мінулага году.

Што, па мойму, трэба зрабіць, каб павысіць якасьць кіраўнікоў? Перш за ўсё трэба, каб мэтадычныя сэмінары, якія раней ставілі мэту апрацоўкі кіраўнікоў па лініі мэтодыкі політшкол, павінны паставіць мэту і павышэньня якасьці ведаў, іх замацаваньня.

Склікаючы ўсіх слухачоў сэмінарый, можна паставіць даклады райсавету аб масавай працы савету, даклад раённага коопэратыву, аб тым, як практычна масы пайшчыкаў упрагваюцца ў барацьбу за зьніжэньне цэн, удзешаўленьне апарату і г. д. Скарыстоўваючы гэты цікавейшы мясцовы матар'ял, пры прапрацоўцы адпаведных праграмных пытаньняў, мы даб'ёмся большай актыўнасьці слухачоў політшкол і лепшага ўсваеньня тэорытычных пытаньняў.

Хутка будзе праводзіцца перадзьездаўская дыскусія. У часе яе разгортваньня і прапрацоўкі рашэньняў 15-га зьезду партыі трэба добра падкаваць на ыя пропагандысцкія сілы на ўсіх дыскусыйных і зьездаўскіх пытаньнях. Карысна склікаць для гэтага сходы кіраўнікоў, ставіць даклады кваліфікаваных пропагандыстых.

Пэрыядычна склікаючы нарады кіраўнікоў, старастаў, актыўных слухачоў і агітпропактыву, трэба на хаду спраўляць работу школ, прыладжваць да яе мясцовы агітпропгабінэт, з маючыміся ў ім фактычнымі матар'яламі, зьнішчыць мертвячыну і сухасьць у працы кіраўнікоў.

А. Е.



Школа—не прахадны двор.

(Менск, гарраён).

Практыкавалася так: пры комплектаваньні політшколы, райком пасылаў ячэйкам паперку, тыя складалі сьпісы, дасылалі ў школы. У школах разьбівалі па групах і заняткі пачыналіся.

Потым, звычайны малюнак: комсамольцы пераводзіліся з катэгорыі ў катэгорыю, з групы ў групу, а потым... са сьцен школы. Амаль уся першая палова году праходзіла ў адсейваньні саміх вучняў. Гэта было таму, што ячэйкі залічвалі ў сьпісы ўсіх тых, якія нідзе не займаліся, ня гледзячы на тое, ці падыходзіць даны комсамолец да школы. Школа ў сваю чаргу не правярала тых, каго прымала, кіруючыся пры гэтым сьпісамі ячэек. У выніку палова ўступіўшых у школу ня скончылі яе.

У гэтым годзе райком парашыў стварыць спэцыяльную камісію для праверкі накіраваных у школу. Яна высьвятляе агульную і політычную адукацыю комсамольцаў, іх здольнасьць, жаданьне вучыцца.

* * *

У калідоры, перад пакоем, дзе засядае камісія—шмат моладзі. Ажыўлена гутараць, спрачаюцца, хто ў якую групу пападзе, ці «строгая» камісія, якія пытаньні задаюць.

Камісія падбірае ў групы па здольнасьці, па аднолькавай агульнай адукацыі, па політразьвіцьці, па мове, па вытворчым прынцыпе. Робіцца так, каб адны не забівалі актыўнасьці другіх, каб адны не заскаквалі наперад, а другія цягнуліся-б у хвасьце. Мы таксама адмаўлялі ў прыёме тым, хто надта дрэнна чытае, накіроўвалі іх у лікбезы.

Наогул мэтод працы камісіі сябе апраўдаў, мы далі пачуць комсамольцам, што політшкола таксама школа, што да яе трэба сур'ёзна адносіцца.

Сёньня — першыя «організацыйныя» гутаркі. Сёньня нам пакажа, як ячэйкі падрыхтаваліся да вучобы.

Рубенчык.



З фронту падрыхтоўкі.

Эх, бюро ячэйкі!

(Віцебск, яч. ЛКСМБ Комтрэсту).

Спачатку лета ў ячэйцы організаваліся гурткі самадукацыі для навічкоў па бягучай політыцы, па вывучэньні гісторыі партыі. За ўсё лета былі праведзены 2-3 заняткі, астатнія зрываліся: **ці ня прыходзіў рукавод, ці самі удзельнічачыя не зьяўляліся. Бюро ячэйкі нічога не рабіла, каб зьнішчыць недахопы.** Узімку ў нас будзе існаваць гурток для пазьменных рабочых (кандуктароў). Неабходна сачыць, каб у ім ня было перабояў.

І. Дварсон.

Дарослыя цягнуцца ў школу

(Мястечка Ляды, Аршаншчына).

У Лядзянскай комсамольскай політшколе замест трох груп цяпер організаваліся чатыры. **Уцягнута 100 чалавек моладзі,** з іх каля 30 беспартыйных. Падалі заявы больш 40 чалавек беспартыйнай моладзі, сярод іх—заява 40-гадовага сябра профсаюзу. Ён вельмі зацікавіўся комсамольскай вучобай і хоча з намі вучыцца. Жаданьне вучыцца ёсьць, толькі трэба паклапаціцца аб кіраўнікох.

Б.

ПРАЗ ДВА ТЫДНІ...

Як хто спаткае Кастрычнік?

Мазольнымі рукамі творым новы сьвет.

Скарысталі вопыт задубскіх комсамольцаў.

Што мы зробім за тры гады.

(М.-Стахаўская ячэйка ЛКСМБ, Барысаўскі р.)

Каб скарыстаць вопыт другіх комсамольскіх ячэек у галіне гаспадарчай працы, а таксама з мэтай вывучэньня шляхоў, ідучы якімі атрыманы ўзорныя дасягненьні, наша ячэйка парашыла на шырокім сходзе вясковай моладзі **прапрацаваць матар'ял агляду Задубскай ячэйкі, які быў праведзены газэтай «Чырвоная Зьмена».**

У адзін сьвяточны дзень хата сакратара ячэйкі была бітком набіта моладзьдзю і дарослымі сялянамі. Яны ўсе прышлі **пазнаёміцца з дасягненьнямі Задубскай ячэйкі** і прыняць удзел у **намячэньні канкрэтнага пляну палепшаньня сялянскіх гаспадарак вёскі М.-Стахава.**

Сход праходзіў вельмі ажыўлена. Пасьля зачытаньня таго ці іншага артыкулу, кожны з прысутных хацеў выказаць свой погляд аб прыстасаваньні пачынаньняў задубскіх комсамольцаў да умоў свае вёскі. На сходзе выказалася больш 20-ці чалавек. Выступалі і комсамольцы і беспартыйныя. Адзін кажа: **патрэбна і ў нас організаваць чарапічна-цаглянае таварыства.** Другі яго папярэджвае, што ў нашых умовах яно яшчэ **будзе няжыцьцёвым,** бо няма патрэбных спэцыялістых і матар'ялу—гліны добрай. І тут-жа выносіць прапанову — **організаваць мэліорацыйнае таварыства.**

Трэці падае думку аб стварэньні малочнай гаспадаркі. Выступіўшы **пажылы селянін** прапануе організаваць **машыннае таварыства.**

І, урэшце, было ўхвалена выпрацаваць плян дзелу ячэйкі і моладзі гаспадарчым будаўніцтве, разьлічаны на бліжэйшыя тры гады. Для выпрацоўкі пляну на падставе выказаных прапаноў была вылучана камісія з 5-ці чалавек.

Выпрацаваны 3-хгадовы плян перад ячэйкай паставіў конкрэтныя задачы:


— Параіцца з адпаведнымі організацыямі аб стварэньні малочнага таварыства. Калі на гэта ёсьць умовы—апошняе стварыць у бліжэйшы год. Далей ідуць заўвагі аб **адшуканьні сродкаў, аб скарыстаньні мэліорацыйната таварыства для паляпшэньня сялянскай сенажаці і г. д.**

Выпрацаваны плян зачытваўся на агульным сходзе сялян, дзе атрымаў поўнае адабрэньне.

Ячэйка ўзялася за выконваньне задач, вызначаных плянам.

Т. Качан.

Пераносная карыкатура на Чэмбэрлена.



Яна робіцца з фанэры і складаецца з 3 кускоў. Першы кусок—тулава Чэмбэрлена (па грудзі). У ім з-заду робіцца прарэз і скаба, у якія ўстаўляецца 2-гі кусок — галава Чэмбэрлена на доўгай шыі. 3-ці кусок служыць сагнутай рукою і ў ёй капялюш. Гэты кусок прыбіваюць цьвікам да тулава так, каб ён мог рухацца. І яшчэ прымацоўваецца шнур з тоўстага дроту і на руцэ і на шыі. Калі мы ўмацуем карыкатуру ў становішчы намалёваным зьлева і пачнем зараз падымаць шыю—шнурок аслабне, рука ападзе і зьніме капялюш. Атрымаецца так, як намалёвана на малюнку справа. Прыпасоўваньні галавы назад—адваротнае.

Такую карыкатуру трапна весьці ў калам ашцы, каб ня было відно чалавека, які кіруе рухамі карыкатуры.

Наша жыцьцё палепшала.

(Стара-Дароскі раён).

За апошнія гады будаўніцтва нашага раёну значна разгарнулася. Усе дасягненьні ў гэтым напрамку будуць падлічаны ў дні сьвяткаваньня Кастрычніка, да чаго ўжо вядзецца ўпартая падрыхтоўка.

Што зроблена?

Пабудаваны ў дзьвёх вёсках новыя школы, адчынена некалькі мэдыцынскіх пунктаў, рыхтуецца да адчыненьня раённы дом селяніна, адшуканы сродкі для найму бядней-шым вучням сямігодкі кватэр. У мястэчку збудавана некалькі калодзежаў. Скончана земляўпарадкаваньне ў вёсцы Язель і Вярхуціна. Адчынена 8 новых вясковых школ. Стара-дароскае спажывецкае таварыства вылучыла ў дзіцячы фонд імя Леніна 50 руб., на дапамогу дзіцячых ясьляў і пляцовак—200 руб., на літаратуру для вясковых хат-чытальнь—125 руб., для набыцьця чароўнага ліхтара—200 руб., у фонд коопэраваньня беднаты—350 руб. Сельска-гаспадарчае таварыства організоўвае ў аднэй вёсцы машыннае таварыства.

Дзякуючы стараннасьці комсамольскіх ячэек, адчынена некалькі чырвоных кутkоў і організавана некалькі ваенных гурткоў і ячэек ТСА-авіахіму.

Моладзь рыхтуе вечары і розныя ўвесяліцельныя часткі для лепшай адзнакі вялікага юбілею пролетарскай рэволюцыі.

Сарока.

Наша воля.

(Прыпеўкі)

Наша—воля,
Наша—поле,
Лес багаты і лугі;
Няма болей
Ў сэрцы болі,
У сэрцы цяжкае тугі.

* * *

За мяжою
Паны млюць,
Востраць зубы ўсё на нас
Хоць ня лады,
Але гадаў
Не баімся... Ня той час.

* * *

Варка, Варка,—
Пролетарка!
Адным словам—маладзец.
Брала лоўка
Ты вінтоўку.
У вайну—была стралец.

Вось ад пана
Ў двары Яна
Шмат лілося людзкіх сьлёз.
Пану ў шыю,—
Вон паршывы!
А ў двары—цьвіце саўхоз.

* * *

Ой, Улюта
Нам пакута
Была ў пана у двары.
Без паночка—
Што ў мядочку,
Аж пацеха ўсіх бярэ!

* * *

Ух, жандармы,
Нашы дарма
Плечы рэзалі ня раз.
Дудкі болей!
Вы—бяз волі!
Няма права вам у нас.

З. Бульбянік.

Куды ідзе опозіцыя?

Тав. Ленін у аднэй з сваіх апошніх работ, надрукаванай 25-га красавіка 1923 году пад загалоўкам **«Как нам реорганизовать рабкрин»,** паказваў на цяжкасьці нашай барацьбы і паказаў дзьве магчымасьці расколу: асноўнай небясьпекай ён лічыў узьнікненьне «сур'ёзных клясавых рознагалосьсяў» між рабочымі і сялянамі. Ён гаварыў, што калі такія клясавыя рознагалосьсі зьявяцца, «тады раскол будзе немінучы» (том 15, частка другая, 115 старонка).

Але паказваючы на гэта, тав. Ленін зараз-жа дадаў: «у нашым соцыялістычным ладзе не закладзены з неабходнасьцю падставы такога расколу, і галоўная задача нашага ЦК і ЦКК, як і нашай партыі ў цэлым, зьяўляецца ў тым, каб уважліва сачыць за абставінамі, з якіх можа вынікаць раскол і папярэджваць іх».

Другой магчымасьцю расколу ён лічыў «асабістыя і выпадковыя абставіны». Прапануючы рэорганізацыю Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі, тав. Ленін бачыў у сваёй прапанове політычную выгаду, якая заключаецца ў тым, што члены ЦК і ЦКК будуць лепш падрыхтаваны і асьвядомлены к пасяджэньням Політбюро. Акрамя таго, ён пісаў: «Да ліку выйгрышаў прыдзецца таксама аднесьці і тое, што ў нашым ЦК зьменшыцца ўплыў чыста асабістых і выпадковых абставін, гэтым самым зьнізіцца небясьпека расколу».

З гэтых пунктаў погляду, паказаных тав. Леніным, і трэба падыйсьці да таго, што робіць опозіцыя. Зараз, калі мы падыходзім да 10-цігадовага юбілею Кастрычнікавай рэволюцыі, мы можам цьвёрда сказаць, што саюз рабочае клясы з сялянствам моцны, што ніякіх клясавых разыходжаньняў і разнагалосіц у пролетарыята з сялянствам няма.

Раз няма клясавых разыходжаньняў у пролетарыята з сялянствам, дык няма падстаў, а значыцца няма і глебы для большых разнагалосьсяў у партыі. Тут трэба чотка і ясна ўявіць: з якой часткай сялянства ў нас няма рознагалосься. Сялянства не зьяўляецца аднароднай масай. Мы маем у ім кулацкую вяршынку, асноўную шматлікую масу серадзякоў і, нарэшце, пласт маламоцных, беднякоў і батракоў.

Апошняя група—гэта апора Савецкай улады і партыі ў вёсцы. Аб яе інтарэсах клапоціцца партыя і Савецкая ўлада, і ўсе свае мерапрыемствы накіроўвае на падтрыманьне і ўзмацненьне позіцый гэтай часткі сялянства. Серадняк—гэта саюзьнік. Але ў той-жа час серадняк—гэта тая частка сялянства, якая яшчэ і цяпер можа падпасьці пад хістаньне. За ўплыў на серадняка мы вядзем барацьбу з кулакамі і буржуазіяй.

Тав. Ленін гаварыў: «... лёс нашай рэспублікі будзе залежыць ад таго—ці пойдзе сялянская маса з рабочай клясай, захоўваючы вернасьць саюзу з ім, альбо яна дасьць «нэпманам» (гэта значыць новай буржуазіі) разьяднаць сябе з рабочымі, расколоць сябе з імі».

Маніфэст, які выпусьціла юбілейная сэсыя ЦВК, як і ўся політыка Савецкай улады і нашага ЦК, гаворыць упаўне вызначана за тое, што ні ў беднаты, ні ў серадзякоў няма ніякіх падстаў для нездавальненьня кіраўніцтвам нашай партыі і для разрыву саюзу з рабочай клясай і пераходу на бок буржуазіі.

Падставы для нездавальненьня ёсьць, вядома, у кулака і ў буржуазіі, але саюзу з імі партыя і рабочая кляса ня шукаюць і ня хочуць, і таму, калі ёсьць тыя ці іншыя прыхільнікі расколу ў нашай партыі, дык, напэўна, што яны не зьяўляюцца выявіцелямі інтарэсаў працоўных. Хочуць яны гэтага ці ня хочуць, але яны прадстаўляюць інтарэсы нездаволеных пролетарскай дыктатурай груп. Такія «раскольнікі» нам ня страшны.

Раскол з-за «асабістых абставін». Але наш ЦК і наш ЦКК у дастатковай меры аўтарытэтны і сапраўды «ня гледзячы на асобы» і ня пужаючыся «аўторытэтаў» цьвёрда вядуць сапраўдную ленінскую лінію. І калі некаторыя сябры партыі скардзяцца і нездаволены, што большасьць адхіляе іх «аўторытэтныя» прапановы і думкі, дык «асабістых» абставін у іх для скаргаў не павінна быць. Іх думка адхіляецца не таму, што іх хочуць пакрыўдзіць, а таму, што яны загаварылі трацкісцкай прозай дарэволюцыйнага пэрыоду і прапануюць мерапрыемствы, якія павінны раскалоць наш саюз з серадняком.

Опозіцыя, пераходзячы да розных нелегальных способаў барацьбы, хоча напужаць організацыяй другой партыі, хоча выйсьці з нашай партыі, «моцна стукнуўшы дзьвярыма». Але раскол зрабіць ёй ня ўдасца. Гэты ход ужо асуджаны ўсёй партыяй і ўсёй рабочай клясай і сялянствам. Гэта будзе не раскол, а выхад групкі людзей.

Можна напомніць опозіцыі словы тав. Зіноўева, сказаныя на 13 зьезьдзе партыі: «Няма той групы, якая можа раскалоць нашу партыю, як-бы яна сябе ні называла». І яго другія словы, сказаныя тав. Радэку на активе Маскоўскай організацыі 11 кастрычніка 1923 году: «Ніякага расколу ў нас ня можа быць і ня будзе па тэй прычыне, што тыя, як я хочуць цяпер волі фракцый і груповак і якія загаварылі паўменшавіцкай прозай, не зьбяруць у нашай партыі і трох процантаў».

Мы павінны дадаць да гэтага, што цяперашнія раскольнікі не набяруць і малой долі проценту. Партыя моцна, як ніколі. Яна была, ёсьць і будзе ленінскай партыяй.

Н. Кузьмін.

У КОЖНАГА—АБЛІГАЦЫЯ.

За пашырэньне пазыкі індустрыялізацыі.

Пазыка даступна сялянству.

Для таго, каб пазыка індустрыялізацыі была больш даступнай шырокім колам сялянства, Наркамфін парашыў дапусьціць для сялян пры ўмове колектыўнай падпіскі, растэрмінаваньне плацяжоў за облігацыі на 7 месяцаў.

Колектыўная падпіска сярод сялянства павінна ісьці па лініі коопэрацыі, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, саўхозаў і калхозаў. Акрамя гэтага, могуць быць створаны і спэцыяльныя колектывы сялянскіх падпісчыкаў.

На чыгунку і ў армію.

Па ўмове, заключанай з Наркомам Шляхоў Зносін і Наркамваенморам, колектыўная падпіска на пазыку індустрыялізацыі сярод чыгуначнікаў прымаецца з растэрмінаваньнем на 9 месяцаў, для вайсковых служачых дапушчаецца растэрмінаваньне да 10 месяцаў.

На чыгунцы і ў вайсковых частках ствараюцца спэцыяльныя камісіі па распаўсюджаньні пазыкі.

Гомельшчына ўперадзе.

Па Гомельскай акрузе рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 136.880 рублёў.

* * *

На 25.015 рублёў распаўсюджана пазыкі ў Віцебшчыне. Заяўкі паступілі яшчэ на 80 тысяч рублёў.

* * *

Па Мазырскай акрузе рэалізавана пазыкі на 40 тысяч рублёў.

Падпісаліся ня ўсе комсамольцы.

За першыя толькі два дні падпіска на пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых Міншвею дала **6 тыс. руб.**

Зараз рэалізавана пазыкі на суму каля 7 тысяч рублёў. Падпісалася 226 чалавек.

Маладыя рабочыя Міншвею Левін і Шустар набылі абліганыяў пазыкі на 100 проц. сваёй зарплаты.

Комсамольцы-ж далёка ня ўсе падпісаліся на пазыку, некаторыя з іх нават адмаўляліся ад падпіскі.

Ячэйцы трэба прыняць усе меры да таго, каб усе комсамольцы і рабочая моладзь Міншвею былі першымі ў гэтай кампаніі, а не цягнуліся-б у хвасьце. **М.**

Наркамзем падцягнуўся.

Яшчэ некалькі дзён таму назад у Наркамземе аб пазыцы індустрыялізацыі ня было і чуваць.

Зараз справа зусім зьмянілася.

90 проц. служачых Наркамзему падпісаліся на пазыку на 6600 руб., што ў сярэднім складае па 60 руб. на чалавека.

Работніцы падпісваюцца.

З 43 работніц швэйных майстэрняў на пазыку індустрыялізацыі падпісалася 30 чалавек на суму 400 руб.

2-й лячэбніцы пазыка не кранулася.

У колектыве 2-ой лячэбніцы складаючым 230 чалавек, аб пазыцы індустрыялізацыі, быццам і ня ведаюць.

Падпіска яшчэ не пачалася.



Выклікаю:

Падпісваюся на пазыку індустрыялізацыі на 100 проц. сваёй месячнай пэнсіі 100 руб. і выклікаю падпісацца на 100 проц. сваёй пэнсіі наступных таварышоў комсамольцаў:

Баркана, Ігнаценка, Лісевіч (ЦВК), Харытановіча, Клюйко, Радкевіча, Плучыка (ЦК ЛКСМБ), Шэўчыка, Салея, Яворскага, Кобэра, Альтшуль Д., Турэцкую, Глазунова, Яўстафіева (БДУ), Козунава, Кучура (КОМВУЗ). **Сыс.**

Гарсавет дае справаздачу

У пачатку лістапада распачнецца справаздачная кампанія Менскага гарсавету перад рабочымі і служачымі гораду.

Дэпутаты гарсавету на сходах ва ўстановах і прадпрыемствах будуць рабіць справаздачы ня толькі аб дзейнасьці савету ў цэлым, але і аб сваёй працы ў якасьці членаў савету.

За вывучэньне беларускай літаратуры

Пры клюбе „КІМ“ організаваны беларускі літаратурны гурток, якім будзе кіраваць маладнякоўец Андрэй Александровіч. Запіс у новы гурток штодзенна ў канцэлярыі клюбу а 10-й гадзіне ўвечары.

Адначасова працягваецца запіс (да 25 кастрычніка) ў гурткі—беларускі драматычны, расійскі драматычны, шахматна-шашачны, вайскова-санітарны і НОП (навуковай організацыі працы).

„ЦІП‘аўцы“ ля варштатаў.

Першы выпуск курсаў ЦІП‘у, які адбыўся некалькі месяцаў назад, ужо цалком забясьпечаны работай па сваёй спэцыяльнасьці.

У зьвязку з гэтым, Наркампрацы мяркуе правесьці ў лістападзе чарговы выпуск курсаў, які дасьць яшчэ 140 кваліфікаваных рабочых

Гурткі першай дапамогі

Па БССР зараз існуе 150 гурткоў першай дапамогі, організаваных „Чырвоным Крыжам“, якія яднаюць 4000 членаў.

Дзеля большага ахопу рабочых і служачых гэтымі гурткамі, ЦК «Чырвонага Крыжу» пастававіў у наступным годзе організаваць на ўстановах і прадпрыемствах яшчэ 500 гурткоў.

Якая наша краіна.

Пры Інбелкульце заснаваны новы аддзел па вывучэньні прыроды і гаспадаркі БССР.

У веданьні аддзелу знаходзіцца: Гэолёгічны інстытут, зоолёгічны музэй, батанічны сад.

Бронзавы камісар.

У майстэрні мастака-скульптара тав. **Бразэра** заканчваецца работа над гліняным бюстам тав. **Мясьнікова**—аднаго з заснавальнікаў комуністычнай партыі Беларусі, главкома заходняга фронту ў першыя дні Кастрычніка, загінуўшага пры аварыі аэроплану ў 1925 годзе. Бюст будзе адліты на бронзу і зьмешчаны ў будынку ЦВК БССР.



Бюст Мясьнікова.

Фотографіі ніколі ня могуць даць поўнага вобразу мастаку. Тав. **Бразэру** прышлося карыстацца ня толькі фотографіямі, але і адрыўкамі ўспамінаў аб **Мясьнікове** людзей, якія яго добра ведалі

Ужо гэтыя ўпарта зложаныя губы, моцныя сківіцы, і вялікі магутны лоб утвараюць вялікае ўражаньне.

Тав. **Кнорын**, які наведаў майстэрню **Бразэра**, ацаніў яго работу проста і моцна!

— Гэта ён! Такім я яго ведаў! **А. К.**

Кастрычнік ідзе.

Хуткім тэмпам.

Работы па пабудове Бабруйскага дрэваапрацовачнага камбінату ідуць хуткім тэмпам. Ужо закончаны лесапільны завад і сартыровачная станцыя.

Закладка электрастанцыі і ўрачыстае адчыненьне чыгуначнай галіны прыстасоўваюцца да 7 лістапада.

Работу—беспрацоўным.

Да сьвята Кастрычніка ў Віцебску рыхтуецца адчыненьне двух новых працколектываў—шаўцоў і войлачнікаў. Таксама пашыраюцца і пераабсталёўваюцца іншыя віцебскія працколектывы.

Дзякуючы гэтаму, у дні сьвята атрымаюць работу звыш 300 чалавек беспрацоўных.

Канцэрты па радыё.

ЦІ саюзу працаўнікоў мастацтва організоўвае да Кастрычніка вялікі сымфонічны оркестр з шырокай рэволюцыйна-музычнай праграмай.

Концэрты оркестру будуць перадавацца ў дні сьвята па радыё.

Электрычнасьць у рабочых пасёлках.

Белжылсаюз прызначыў закончыць да 10-ці годзьдзя Кастрычніка работу па электрофікацыі новапабудаваных рабочых пасёлкаў у Менску.

Ужо праведзена ўнутраная праводка ў 8-мі кватэрах.

Ведай гісторыю Кастрычніка

10 год назад.

22, 23, 24 кастрычніка.

У процівагу растучаму фронту рэволюцыі, складаецца і ўмацоўваецца контр-рэволюцыйны фронт—фронт капіталістых і абшарнікаў.

Згодніцкі. коаліцыйны ўрад рыхтуецца ўцякаць з Петраграду ў Маскву. Гэта робіцца для таго, каб, здаўшы Петраград, які ўжо вызначыўся. як штаб рэволюцыі, немцам організаваць у Маскве супольна са зграяй чарнасоценных генэралаў Каледзіных і Аляксеевых, новую, больш небясьпечную змову супроць рэволюцыі.

Чакаць больш нельга! 23 кастрычніка склікаецца пасяджэньне ЦК РСДРП (бальшавікоў), якое па дакладу Леніна аб неабходнасьці ўзброенага паўстаньня прымае большасьцю 10 галасоў супроць двух, рэзолюцыю ў станоўчым сэнсе. Абрана політычнае бюро ЦК для кіраўніцтва паўстаньнем.

24-га кастрычніка адчыніўся зьезд саветаў паўночнай вобласьці, які прыняў рэзолюцыю аб падтрыманьні бальшавікоў і салідарнасьці з імі.

* * *

Да гэтых дзён на заходнім фронце адбыўся поўны пералом у настрої вайсковых частак. Дзякуючы недахопу памяшканьняў, кармленьня, вопраткі і, галоўнае, востраму жаданьню, як бы там ні было, але скончыць вайну, салдаты, па заключэньні камандных складаў, прызнаюцца ненадзейнымі і небаяздольнымі. Сярод арміі карыстаецца вялікім уплывам агітацыя бальшавікоў і іх газэта „МОЛОТ“.

Шматлікія рэзолюцыі, прымаемыя агульнымі сходамі салдат па палкох і дывізіях, констатуюць, што—„ЧАСОВЫ ЎРАД СВАЁЙ ПОЛІТЫКАЙ ПРОСТА ДАПАМАГАЕ РАЗЬВІЦЬЦЮ КОНТР-РЭВОЛЮЦЫІ“; што „АДЗІНЫМ ШЛЯХАМ ДА АДРАТАВАНЬНЯ РАСІІ І РЭВОЛЮЦЫІ ЗЬЯВІЦЦА ПЕРАХОД УСЁЙ УЛАДЫ ДА САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, САЛДАЦКІХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧАЦЬ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЯЙ, АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ МІРУ, 8-МІГАДЗІННАГА ПРАЦОЎНАГА ДНЮ, ПЕРАХОД ЗЯМЛІ ДА СЯЛЯН. ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ—ДА РАБОЧЫХ“.


Гэты пералом у настроях салдат, які вызначыў іх адносіны да бягучых падзей, меў вялізарнейшае значэньне. Імення дзякуючы яму, бальшавікі, забясьпечаныя па Захфронту падтрымкай і спачуваньнем салдацкіх мас, здолелі, як убачым далей, утварыць пераварот, які закончыўся перамогай.

№ 76 Шахматы і шашкі № 76

Пад рэдакцыяй П. Ліпкінда

Задача № 11.

П. Ліпкінда. (Менск)




Белыя: Крe5, Лf1, Ка4, Ке2, Сf8.

Чорныя: Крd2, Сb1, Кb7, пп: а3, е6.

Мат у 2 хады.

Эцюд № 5 (шашачны).

Э. Мазэль (Менск).



Белыя: пп: а3, с1, d4, d6, g1, h2...(6)

Чорныя: D—d8, е1, g7, h4, п b6... (5)

Белыя робяць нічыю.

Шахматны чэмпіонат СССР

Падыходзіць к канцу гульня ў чэмпіонаце СССР. Уперадзе ўсіх удзельнікаў ідуць **Раманоўскі** (чэмпіон Ленінграду), **Дуз-Хацімірскі** (Масква) і **Багатырчук** (Украіна). Адзін з гэтых ігракоў, мусіць, і зойме першае месца і атрымае званьне гросмайстра і чэмпіона СССР.

Адчуваецца зморанасьць усіх удзельнікаў чэмпіонату. Гэтым і тлумачыцца тое, што чэмпіон Беларусі **Касьперскі**, уладаючы моцнай вытрымкай, выграў у **Ільліна-Жанеўскага**, зрабіў нічыю з Ненарокавым, Паўлавым-Пʼянавым і ў партыі з Багатырчуком мае роўнае становішча.

Шахматна-шашачныя навіны

Менск. У культаддзеле ЦСПСБ адбыўся ў сераду, 19-га кастрычніка, сход шахматыстых і шашатыстых—сяброў профсаюзаў гор. Менску. Сход вынес пастанову аб ажыўленьні шахматна-шашачнага жыцьця ў рабочых клюбах Менску. Для гэтага трэба організаваць шахматна-шашачную сэкцыю пры культаддзеле ЦСПСБ. Таксама сход пастанавіў, каб шахматыстыя і шашаыстыя ў кастрычнікавых сьвяткаваньнях выступілі на дэманстрацыі сумесна з фізкультурнікамі і, пры добрым надворʼі, організавалі жывую шахматную гульню.

* * *

Пачаўся чэмпіонат вучнёўскага клюбу, у якім прымаюць удзел 36 чалавек. Усе ўдзельнікі падзелены на групы па 6 чалавек у кожнай. Гуляюць па адвэй партыі кожны з кожным.

Орша. 9-га кастрычніка скончыўся масавы шахматна-шашачны турнір моладзі, у якім прымалі ўдзел 36 чалавек.

Як на шахматах, так і па шашках пераможнікам зьявіўся **Рафаэль Пайкін**.

Правільна рашылі

Правільнае рашэньне задачы № 10 прыслалі т. т. **А. Зысман** (Менск), **Аляксееў Н.** (Марына-горскі тэхнікум), **Гордон Г.** (Менск) і **Ойч Н.** (Менск)

Эцюдаў № 2 і № 3, задачы № 8—Гардон.
Эцюд № 4—**А. Зысман і Сьляпян** (Менск).

Выклік

Пайкін Рафаэль (Орша) выклікае на матч па перапісцы ў шашкі **Левіна І.** (Барысаў). Адрас Пайкіна: Орша, Загародны зав., 34.

На хвалі 1155 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Савнаркому БССР).

Сёньня перадаецца наступная праграма: 5 г. 20 хв.—**„Чырвоная Зьмена“**; 5. 50—Даклад **ЦБ ЮП—„Як піонэр павінен сьвяткаваць Кастрычнік“**: 6. 20—**Радыё-газэта № 182**; 8. 00—**Праверка гадзіньнікаў**; 8. 5—**Гутарка ТДА-Авіахіму—Фінляндыя і яе армія**; 8. 30—**Вечар скокаў**.

Заўтра перадаецца: 6 г. 00 хв.—Даклад Наркамасьветы—**„Кастрычнік і дашкольная асьвета ў БССР“**; 6. 30—**„Беларуская вёска“**: 7. 15—**«Беларускі Піонэр па радыё**; 8. 45—**„Навіны радыё па радыё“**; 9. 15—**Концэрт ці трансляцыя**.

У панядзелак будзе перадавацца: 5 г. 20 хв.—Гутарка па радыё-тэхніцы—**„Катушкі самаіндукцыі“** і 5. 50 Гутарка—**„Чырвоная армія і пагроза вайны“**; 6. 20.- **Радыё-газэта № 183**; 8. 00—**Праверка гадзіньнікаў**; 8. 05—**Концэрт з цыклю—«Камэрная музыка расійскіх композытараў»**.

Папраўка.

Прашу рэдакцыю зьмясьціць наступныя дзьве папраўкі ў мой артыкул, зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене“ ад 20-X 27 г. № 118.

1. Пасьля слоў „аб організацыі вельмі цікавай справы Астраўнянскай ячэйкай надрукаваць замест—„Сьмілавіцкага раёну“—„Сьвіслацкага раёну“, паколькі першы раён Менскай акругі, а другі—Бабруйскай, аб рабоце ячэек якой і быў напісаны артыкул.

2. Надрукаваць дадатак, пасьля слоў: „Ячэйка організавала газэтны гурток, ён рэгулярна, два разы ў тыдзень, працаваў на працягу ўсяго лета“—такога зьместу» і які рэгулярна наведвала 125 чалавек дарослых сялян, моладзі і комсамольцаў“.—Паколькі без такога дадатку траціцца сэнс і каштоўнасьць організацыі такога гуртка Астраўнянскай ячэйкі. **П. Пячонка.**

Згублены.

— Комсамольскі білет за № 2808, на імя Мукасея М. І., выдадзены Слуцкім акругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 127, на імя Барана Э. Д., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

Абвестка

Агульна-гарадзкая конфэрэнцыя рабочай моладзі, скліканая на 16 кастрычніка, г. г.—**адкладаецца на 22 кастрычніка ў суботу, а 6-й** гадзіне ўвечары.

Парадак дню конфэрэнцыі:

1. 10 год існаваньня Савецкай улады. 2. Даклад аб экономічна-адукацыйнай рабоце сярод рабочай моладзі. 3. Інформацыйны даклад аб мясцовым пляне сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычніка і аб удзеле рабочай моладзі ў сьвяткаваньні. 4. Папярэднія вынікі правядзеньня ўсебеларускага суботніка.

Конфэрэнцыя адбудзецца ў памяшканьні Саўгандальслужачых.



Робячы агляд нашых тэхнічных і культурных дасягненьняў за 10 год рэволюцыйнага будаўніцтва, нельга не адзначыць вялікую цікавую работу Маскоўскага Дзяржаўнага Інстытуту Музыкальнай Навукі („ГИМН»), які ўзнік пасьля рэволюцыі і ажыцяўляе адзін з лёзунгаў Кастрычніка: **«Мастацтва працоўным»**.

Хто з гарадзкой і вясковай моладзі ня ведае балалайкі, гармоніка? Усе знаёмы з іх музыкай, а многія і самі іграюць на гэтых інструментах.

Але, напэўна, мала хто задумваўся над тым, адкуль зьявіліся гэтыя музычныя інструманты? Ці заўсёды яны былі такімі і якімі стануць яны ў будучыні?

«Гимн» дасканала вывучае гісторыю музычных инструмэнтаў і розныя іх віды, каб на грунце гэтага вывучэньня стварыць у сваёй вопытнай майстэрні яшчэ лепшыя і даступныя для шырокіх мас інструманты.

Вялікім дасягненьнем зьяўляецца створаны пры «Гимн‘е» музэй музычных інструмантаў. У маленькім пакойчыку у нізкіх шкляных шафах сабраны гэтыя рэчы розных часоў і народаў.

Вось—модэль музыкальнага інструманту першабытнага чалавека, які забаўляў гукамі людзей за тысячы год да нашых часоў. Па форме сваёй гэты інструмант нагадвае дзеравяны кракетны малаток толькі з кароткай ручкай, на якой нацягнуты валасяныя струны. Гэта старабытная кітайская гітара. Высокая ручка канчаецца галавою выразанага каня, пад ім галава дракона—усё ў яскравых жоўтых фарбах. Тая-ж конская галава на старабытнай румынскай тамбурыцы, якая служыла адначасова гітарай і бубнам.

Армянская тара, каўкаскія кетенчы, саз, старадаўнія народныя інструманты накшталт нашай гітары і мандаліны, якія ўжываюцца яшчэ і зараз на ўсходзе. Адны з іх прыгожа ўхарошаны пэрлямутрам, другія зьбіты з неафарбаваных дошчачак.

Цэлая колекцыя флейтаў, пачынаючы ад простай трасьціковай валынкі і жалейкі пастушка, да складанай флейты сучасных оркестраў.

У другіх шафах ужо апошнія дасягненьні—скрыпкі, віолёнчэлі лепшых замежных і савецкіх майстраў. Вось скрыпка вядомага расейскага майстра **Башава**, халопа графа Шарамецева. Граф пасылаў таленавітага майстра вучыцца ў Парыж, усюды хваліўся яго працай, але не дагадаўся даць яму волю. У асобнай круглай шафіцы захоўваюцца скрыпкі славутага сусьветнага майстра—Страдыварыуса. Больш 100 год прайшло з тэй пары як Страдыварыус стварыў свае скрыпкі, але яшчэ нікому не ўдалося зрабіць лепшага па гуку інструманту, чым яго. Скрыпкі яго да гэтай пары цэняцца на вагу золата. Так за адну з выстаўленых у «ГИМН,е» скрыпак, уладару яе яшчэ ў мірныя часы прапанавалі 40 тысяч рублёў. А некаторыя з скрыпак Страдыварыуса ацэньваюцца ў сотні тысяч.

Вывучэньне гэтых высока-мастацкіх узораў дапамагае вопытнай майстэрні «ГИМН‘а» ствараць добрыя інструманты.

Але асабліва цікава работа «ГИМН‘у» у галіне вывучэньня і пропаганды народнай музыкі і песьні.

У народнай песьні адбіваецца душа народу і, каб ведаць народ, трэба ведаць і яго песьню. Мы ведаем мастацтва Захаду больш, чым мастацтва народаў, што жывуць у нашай краіне—пісаў у адным з сваіх артыкулаў тав. **Луначарскі**. Гэта так. Віною гэтаму зьяўлялася політыка царскага рэжыму, якая з пагардай адносілася да ўсіх «інародцаў».

Цяпер-жа. калі кожны народ зьяўляецца ў нас роўнапраўным, трэба пазнаёміцца нам з нашым мастацтвам.

«ГИМН» вядзе вялікую працу па зьбіраньні народнай песьні, дзеля чаго пасылае невялічкія экспэдыцыі па розных пунктах краіны.

Таксама інстытут выпушчае зборнік і сабраных ім народных песьняў. Урэшце, дзеля падняцьця і разьвіцьця музычнага мастацтва ў краіне, «ГИМН» організаваў спэцыяльныя музычна-этнографічныя курсы, мэтай якіх зьяўляецца падрыхтоўка: 1) навуковых работнікаў, дасьледчыкаў песьні і зьбіральнікаў яе і 2) выканаўцаў народнай музыкі—сьпевакоў, кіраўнікоў хораў, народна-оркэстравых дырыжораў і настаўнікоў школ.

Гэтыя курсы могуць адыграць значную ролю ў справе разьвіцьця музычнага жыцьця нашых нацыянальных рэспублік.

Моладзі, якая цікавіцца пытаньнямі музыкі, варта было-б зьвязацца з «ГИМН‘ам» тым больш, што там ахвотна адказваюць на ўсе паступаючыя запытаньні. Адрас «ГИМН, Москва. Мясницкая улица».

Адказныя рэдактары: { **А. БАРАНЬНІКАЎ.** **А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.